УДК 373.3.016:821.161.3

# ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ВУЧЭБНАГА ДАПАМОЖНІКА ПА ЛІТАРАТУРНЫМ ЧЫТАННІ
## (на прыкладзе казкі Г. Аўласенкі “Сказ пра тое, як Алесік заблукаў аднойчы ў лесе”)

***Я. А. Чысцякова*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. А. Доўгаль***,
дацэнт

Адным з твораў, прапанаваных для вывучэння ў 2-м класе школ з рускай мовай навучання, з’яўляецца “Сказ пра тое, як Алеeік заблукаў аднойчы ў лесе” Г. Аўласенкі. Для арганізацыі працы з ім у дапаможніку па літаратурным чытанні [1] прадугледжаны вучэбна-метадычны комплекс, які ўключае наступныя кампаненты:

1) уступны дыялог герояў дапаможніка, Лянка і Васілінкі, у якім акрэсліваецца тэма ўрока, з адпаведнымі ілюстрацыямі (рэпрадукцыя карціны І. Шышкіна “Раніца ў сасновым лесе” і разгорнутая перад дзецьмі кніга з выявамі лясных жывёл). Дыялогу спадарожнічаюць пытанні / заданні. Адно з іх (*Якія казкі пра лясных звяроў вы чыталі?*) скіравана на актуалізацыю чытацкага вопыту і адначасова ўказвае на жанравую прыналежнасць твора. Другое заданне з’яўляецца мэтавым, яно прапануецца перад першасным успрыманнем: *Паслухайце казку і скажыце, якія лясныя жыхары дапамагалі Алесіку*;

2) тэкст твора (адметнасцю з’яўляецца абазначэнне націску ў вялікай колькасці слоў, што спрыяе правільнасці чытання);

3) ілюстрацыі, якія адпавядаюць асобным момантам твора: на адной паказана, як Алсcік з Зайцам просяць дапамогі ў Вавёркі (развіццё дзеяння), на другой – адлюстраваны эпізод развітання галоўнага героя са зверам, які яго ўратаваў (развязка);

4) пытанні і заданні, змешчаныя пасля твора, маюць рознае прызначэнне: яны скіраваны на аналіз сюжэта (*Як Алесік апынуўся ў лесе? Што з ім здарылася? Што прапанаваў Алесіку Зайчык?*), на характарыстыку персанажаў (*Якія радкі казкі гавораць пра тое, што хлопчык вельмі любіць сваю маму?*), на фарміраваннс ўласнай чытацкай пазіцыі (*Хто з герояў твора вам спадабаўся? Каго з іх вы лічыце ветлівымі? Чаму?*); таксама ў пералік заданняў уключаны тыя, што спрыяюць фарміраванню навыку чытання (прапануецца выбарачнае чытанне і выразнае чытанне па ролях).

Такім чынам, сучасны вучэбны дапаможнік па літаратурным чытанні мае багатыя дыдактычныя магчымасці, выкарыстанне якіх спрыяе якаснаму засваенню зместу мастацкага твора і фарміраванню ў малодшых школьнікаў неабходных уменняў і навыкаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. **Антонава, Н. У.** Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск : НІА, 2016. – Ч. 1. – 136 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова